# ЗЯРНЯТКА 16



*Што мы павінны рабіць?* *Лк 3, 10–18*



Аднойчы: Калі Ян навучаў над Ярданам, пыталіся ў яго людзі: Што мы павінны рабіць? Ён сказаў ім у адказ: Хто мае дзве вопраткі, няхай аддасць таму, хто не мае; і хто мае ежу, няхай зробіць тое самае.

Прыйшлі і мытнікі хрысціцца і сказалі яму: Настаўнік! Што мы павінны рабіць? Ён адказаў ім: Нічога, што больш за дазволенае вам, не патрабуйце.

Пыталіся ў яго таксама і жаўнеры, кажучы: А мы што павінны рабіць? Ён адказаў ім: Нікога не крыўдзіце, не абвінавачвайце несправядліва і задавольвайцеся сваёю платаю.

Калі ж народ чакаў, і калі ўсе разважалі ў сэрцах сваіх пра Яна, ці не Хрыстус ён, Ян адказаў усім: Я хрышчу вас вадою, але ідзе мацнейшы за мяне, якому я не варты развязаць раменьчык на сандалях яго. Ён будзе хрысціць вас Духам Святым і агнём. Лапата Ягоная ў руцэ Ягонай, і Ён ачысціць гумно сваё і збярэ пшаніцу ў свіран свой, а мякіну спаліць агнём непагасным.

Шмат чаго іншага прапаведаваў ён, абвяшчаючы Добрую Навіну народу.

*Гэта Слова Пана.*

**Вялікі сярод цябе Святы Ізраэля.**

# Знайдзі схаваныя рэчы на малюнку.





парусная лодка



цвік



грэбень



малаток



трусік



збан



кавалак пірага



пярсцёнак



шкарпэтка



банан

**Малітва.**

**Навучы мяне, Божа, радавацца ў маім жыцці. Амэн.**